7. Народные песни Ленинградской области. Старинная свадьба Сланцевского района / сост. А. Мехнецов, Е. Мельник. – Л. : Советский композитор, 1985. – 123 с.
8. Попова, И. Свадебная традиция верховьев Суйды: Фольклорная традиция Гатчинского района Ленинградской области / И. Попова // Живая старина. –1999. –№ 3. – С. 32–35.
9. Пушкин, А. Записи народных сказок и песен / А. Пушкин // А. Пушкин. Полное собрание сочинений: в 19 т. 2-е изд., перераб. / отв. ред. Я. Левкович, С. Фомичев. – М. : Воскресенье, 1997. – Т. 17 (доп.): Рукою Пушкина. Выписки и записи разного содержания. Официальные документы. – С. 360–433.
10. Рубцов, Ф. Народные песни Ленинградской области / Ф. Рубцов. – М. : Советский композитор, 1958. – 226 с.
11. Русские народные песни, записанные в Ленинградской области. 1931–1949 гг. / Сост. В. Кравчинская и П. Ширяева; под ред. А. Астаховой; муз. ред. Ф. Рубцова. – Л. ; М. : Гос. муз. изд-во, 1950. – 242 с.
12. Сборник русских народных песен Санкт-Петербургской губернии (Лужского уезда) / сост. К. Галлер. – СПб. : Юлий Генрих Циммерман, 1889. – 32 с.
13. Свадьба : Материалы по свадебному обряду русских Новоладожского уезда Санкт-Петербургской губернии: Середина XIX–XX в. / сост. сб., предисл. И. Рыжова, Д. Горб. – СПб. : Композитор, Санкт-Петербург, 2015. – 128 с., с ил., нот.
14. Сто русских народных песен. Материалы студенческих фольклорных экспедиций / под ред. Ф. Соколова. – Л. : Музыка, 1970. – 97 с.

***Таццяна Пладунова***

**ВЯСНОВЫЯ КАРАГОДЫ Ў ВЁСЦЫ ПІНКАВІЧЫ ПІНСКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ**
***(з вопыту экспертнага заключэння на прапанову аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці)***

***Tatsiana Pladunova***

**SPRING ROUND DANCES IN THE VILLAGE OF PINKAVICHY, PINSK DISTRICT, BREST REGION**
***(from the experience of an expert opinion on a proposal to grant the status of historical and cultural value)***

*У артыкуле прааналізаваны стан і перспектывы фальклорнага мастацтва ў заходнепалескай вёсцы Пінкавічы, дзе мясцовай супольнасцю спявачак пры падтрымцы жыхароў вёскі і яе ваколіц самааддана і стромка захоўваецца традыцыя ваджэння вясновых карагодаў: у першы дзень Вялікадня; праз тыдзень у так званую Праводную нядзелю; а таксама ў панядзелак пасля Праводнай нядзелі.*

*The article analyzes the state and perspectives of folk art in the Pinkavichy village (West Palessie). There is the roun dances tradition wich is conducted: on the first day of Easter; on Conduction Sunday (a week later); and on Monday after the Conduction Sunday.*

Праблема адраджэння яскравых праяў народнага мастацтва ў Беларусі пастаўлена на дзяржаўным узроўні і вырашаецца дзякуючы культурна-асветніцкай дзейнасці фалькларыстаў, педагогаў, кіраўнікоў фальклорных калектываў, аматараў традыцыйнай культуры.

Не сакрэт, што сёння пад пагрозай знікнення знаходзяцца традыцыйныя каляндарныя абрады. Аднак мясцовыя жыхары, культработнікі асобных раёнаў імкнуцца спыніць гэты працэс шляхам рэстаўрацыі і нават рэканструкцыі мясцовых абрадавых традыцый. Тым больш гэты пачын падтрымлівае міністэрства культуры Беларусі, якое заклікана ажыццяўляць асноўныя палажэнні па ахове, зберажэнні не толькі матэрыяльных помнікаў культуры, але і пераемнасці беларускіх абрадавых і сацыяльна-побытавых традыцый у сучаснай сацыякультурнай прасторы, што пацвярджаюць закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны» ад 29.12.2004 № 627. Гэтыя заканадаўчыя акты знаходзяцца ў прамой узаемасувязі з палажэннямі ЮНЕСКА па ахове істотнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны свету з мэтай забеспячэння яе лепшай абароны і ўсведамлення яе значнасці. Праз збор розных вусных і нематэрыяльных скарбаў чалавецтва ва ўсім свеце гэтая праграма павінна прыцягнуць увагу да важнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якую ЮНЕСКА вызначыла ў якасці найважнейшага кампанента культуры як сховішча культурнай разнастайнасці і творчага самавыяўлення народаў свету.

У XXI ст. каляндарна-абрадавыя практыкі ў вясковым асяроддзі паступова знікаюць, на жаль, разам са старэйшымі носьбітамі фальклору, і працяг іх адбываецца праз рэстаўрацыю мясцовых свят альбо шляхам іх мастацкага рэканструявання. Аўтару разам з вядучым спецыялістам ІПКіПК БДУКМ А. Каліноўскай давялося ўдзельнічаць у экспертызе традыцыі веснавых карагодаў на Вялікдзень, Праводную нядзелю і «Провады зімы» ў вёсцы Пінкавічы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці на прадмет надання ёй статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці як элементу нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Па выніках гэтай і папярэдняй экспертыз (этнамузыколага В. Яшчанка і фалькларыста Р. Гамзовіч) сёлета гэты элемент унесены ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. У дадзеным артыкуле прыведзены тэкст экспертанага заключэння аўтара як эксперта-этнафоназнаўцы паводле бытавання і якасці пераймання этнафанічнай абрадавай традыцыі ў вёсцы.

По выніках экспедыцыйнага даследавання традыцыі веснавых карагодаў у вёсцы Пінкавічы Пінскага раёна, праведзенага метадам уключанага назірання падчас «Провадаў зімы» 6.05.2019, грунтоўнага абмеркавання з носьбітамі спеўных і абрадавых практык і іх сацыяльнай значнасці для жыхароў вёскі, вывучэння матэрыялаў папярэдняй прапановы і навукова-аналітычнай працы па вызначэнні ступені захаванасці абарадавай і этнафанічнай самабытнасці пінкавіцкай традыцыі, эксперт Т. Пладунова зрабіла наступныя назіранні і высновы.

У вёсцы Пінкавічы мясцовай супольнасцю народных спявачак пры падтрымцы жыхароў вёскі і яе ваколіц захоўваецца традыцыя ваджэння вясновых карагодаў у першы дзень Вялікадня, у нядзелю праз тыдзень, так званую Праводную, і ў панядзелак пасля Праводнай нядзелі, калі падчас ваджэння карагодаў адбываецца абрадавая дзея «Провады



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зімы». Яна заключаецца ў карагодзе-шэсці жанчын, што паступова пераходзіць у бег з разрываннем «путаў», сімвалічна нацягнутых праз вуліцу, і выхадам на бераг возера, дзе адбываецца сімвалічная варажба на будучы ўраджай. Носьбіты традыцыі, жыхары Пінкавіч і іншых вёсак Пінскага раёна, памятаюць, што раней карагоды вадзілі ледзь не штодня ўвесь тыдзень пасля Вялікадня, але зараз імі адзначаюцца толькі пачатак і завяршэнне святочнага перыяду. Карагодная традыцыя ўтрымлівае абрадавыя элементы і асобныя цырымоніі, але ў цэлым мае святочны, гульнёвы настрой.

Абрадавыя цырымоніі «Провадаў зімы» праходзяць на восьмы дзень пасля праваслаўнага Вялікадня (ці Пасхі, як часта кажуць у дадзенай мясцовасці) або, як кажуць на мясцовай гаворцы, «праводнай нэділі», якая наступае на сёмы дзень пасля Вялікадня і азначае, згодна з мясцовымі ўяўленнямі, провады свята, якое адзначалася раней не адзін дзень, а значна даўжэй. Удзельнікі святкавання – жанчыны і дзяўчаты – удзельніцы вясковага фальклорна-этнаграфічнага калектыву «Крыніцы», дзіцячага гурта «Крынічанька», іншых гурткоў дома культуры. Захоўваюць традыцыю мясцовыя жанчыны старэйшага і сярэдняга ўзросту, якія добра ведаюць старадаўнія мясцовыя звычаі па ўласных дзіцячых успамінах і па звестках ад сваіх бацькоў і бабуль. На падставе ўласнага досведу і этнаграфічнага вывучэння сваёй мясцовасці яны штогод узнаўляюць асноўныя акцыянальныя, вербальныя, этнафанічныя, пластычныя, гульнёвыя і атрыбутыўныя кампаненты святочна-абрадавых дзей. Лідары калектыву, якія папаўняюць яго рэпертуар мясцовым фальклорным матэрыялам, а таксама пільна сочаць за дакладнасцю ўзнаўлення карагодаў і песень усяго цыкла, – этнафор Ксенія Даніловіч (1933 г. н.); дырэктар СДК, пераемніца і знаўца рэгіянальных народных традыцый Таццяна Максімчук, адна са стрэйшых спявачак калектыву; Ігар Няхайба, мастацкі кіраўнік гурта. Неабходна адзначыць ролю былых удзельніц калектыву старэйшага ўзросту, хто сёння ўжо не заўсёды мае магчымасць выходзіць у карагоды, але іх творчую спадчыну і ўспаміны беражліва захоўваюць у калектыве.

Асноўнай дамінантай народных вясновых святкаванняў з'яўляецца карагод, які, на думку аўтара, і ёсць асноўны абрадавы і драматургічны алгарытм усяго цыкла традыцыйных велікодных цырымоній у Пінкавічах. Па звестках жыхароў вёскі, айчынных фалькларыстаў, якія ў розныя гады фіксавалі і даследавалі каляндарна-абрадавыя практыкі рэгіёна, святкаванне Праводнай нядзелі і «Провадаў зімы» пасля яе з'яўлялася раней завяршаючым этапам цэлага абрадавага цыклу, які насіў характар усеабдымнай песенна-харэаграфічнай стыхіі адзначэння Вялікадня і праводзін яго ў належны час. Як вядома, Вялікдзень у старажытнасці азначаны як час надыходу вясны і разам з ёю «вялікіх сонечных дзён», для земляроба гэта аграрны Новы год. Якраз працэс надыходу гэтага новага земляробчага году з яго «вялікімі» працоўнымі днямі, абуджэннем прыроды і ўсяго жывога адлюстроўваецца ў свядомасці і дзейнасці супольнасці гучаннем голасу на вольным паветры, кінетычна-пластычнай актыўнасцю з выхадам на вуліцу. І гэта галасная і рухаючая плынь набывае ў веснавы час усеабдымнае значэнне. У кантэксце веснавой тэмпаральнасці пінкавіцкая традыцыя таксама выяўляе моц невербальнага (спеўнага) гуку і магічную сілу руху ў захаваных карагодах і шэсцях.

Карагод – гэта від народнага мастацтва, у якім харэаграфічныя рухі арганічна спалучаюцца з харавым спяваннем і ілюстраваннем паэтычнага зместу. Карагоды былі пашыраны са старажытных часоў у народаў з каляндарна-земляробчай абраднасцю, асабліва ў славян і балтаў. Паводле класіфікацыі вядомага этнахарэолага М. Козенкі, пінкавіцкія карагоды адносяцца да жанру песенных абрадавых веснавых карагодаў, асноўны малюнак якіх кола. Сярод іх вылучаецца некалькі гульнявых ілюстратыўна-выяўленчых («Тарасова жона», «Скачэ горобэйко», «Мак»), падчас «Провадаў зімы» дадаецца карагод-шэсце шэрагамі па вуліцах вёскі («Да проводымо зыму»). Веснавыя карагоды ў Пінкавічах выконваюцца жанчынамі і дзяўчатамі толькі ў пэўны веснавы перыяд – ад Вялікадня да панядзелка пасля Праводнай нядзелі. У Пінскім раёне, як і на тэрыторыі ўсяго Брэсцкага Палесся для абазначэння карагода існуюць два тэрміны – «харавод» і «танок». Першы з іх абазначае нетаропкі рух, другі больш жвавы. Па сведчанні М. Козенкі, класічная карагодная традыцыя была сканцэнтравана ў паўднёва-усходняй частцы рэгіёна – Столінска-Пінска-Лунінецкім арэале [5, с. 6]. Традыцыя ваджэння веснавых карагодаў у Пінкавічах захоўвае тыповыя рысы рэгіянальнай карагоднай традыцыі, якой уласціва колавая форма (нават карагод «Проса», пераважна шэрагавага тыпу ў іншых рэгіёнах Беларусі, тут мае колавую форму).

Трэба адзначыць паўсюднасць пашырэння карагодных і карагодна-гульнявых песень на беларускай этнічнай тэрыторыі. Іх асаблівая яркасць назіраецца ў каляндарна-песеннай традыцыі Падняпроўя (Смаленшчына, усходняя Віцебшчына, Магілёўшчына, Гомельшчына). Аднак на Палессі веснавыя карагоды маюць сваю непаўторную адметнасць. Гэта захаваныя да нашага часу рэлікты веснавой карагоднай традыцыі, прымеркаванай якраз да перыяду ад Вялікадня (вясны) да Сёмухі (лета): «Ваджэнне і пахаванне стралы» на Веткаўшчыне, Чачэршчыне і Браншчыне, «Ваджэнне сулы» у Гомельскім і Чарнігаўскім раёнах, «Юраўскі карагод» на Тураўскім Палессі і часткова Любаншчыне, «Стрылка» у вёсцы Бездзеж Драгічынскага раёна. Відавочна ўключанасць гэтых карагодаў і карагодных гульняў у комплекс земляробчай песеннай абраднасці, сувязь іх з разнастайнымі формамі старажытнай аграрнай магіі (прадуцыравальнай, ахоўнай, карпаганічнай і да т. п.), наяўнасць адпаведных магічна значных рухаў у карагоднай харэаграфіі і пластыцы, іх адлюстраванне ў музычна-рытмічнай і структурнай арганізацыі карагодных напеваў. Сувязь абрадавых цырымоній пінкавіцкай карагоднай традыцыі з названымі абрадамі відавочная ў пластычным вырашэнні (кругавы карагод – як сімвалічны рух Сонца, карагод-шэсце – як абход-абярэг) і этнафанічнай веснавой энергетыцы выканання, якая характарызуецца гучным экстравертным інтанаваннем у акустыцы прыроднага ландшафту.

Карагоды на Вялікдзень і на Праводную нядзелю водзяць у Пінкавічах традыцыйным чынам у розных месцах вёскі – на плошчах, вуліцах, побач з дамамі. Найбольш яркая драматургія абрадавых дзей, якія разгортваюцца ў панядзелак пасля Праводнай нядзелі і носяць назву «Провады зімы», уключае наступныя кампаненты: 1) збор жыхароў вёскі ў адным яе канцы (на цэнтральнай вуліцы каля музея Я.Коласа); 2) выхад жанчын-завадатраў, падлеткаў і ваджэнне імі розных па тэматыцы кругавых карагодаў («Траўка-мураўка», «Скачэ горобэйко дай по юлоньцы», «Тарасова жона», «Пойдэмо в ляс», «Проса», «На крутом бэрэжэчку», «Пуд зэлёным дубом ячмэнь молотыла», «Бабочка», «Ой, поросты, кропэ», «Калына», «Мак»); 3) карагод-шэсце радамі («танкы») у другі канец вёскі, па вуліцы да ракі пад спеў, адпаведны «провадам зімы» («Да проводымо зыму»), што перыядычна перапыняецца вышэй названымі кругавымі карагодамі, якіяо жанчыны водзяць на скрыжаваннях дарог; 4) бег спявачак па вуліцы з разрываннем нітак і вяровак, якімі загадзя перагароджана дарога, што



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўвасабляе сабой разрыванне путаў зімы; 5) выхад да ракі і вырыванне з вады доўгіх сцяблін зелля (варажба на доўгі лён); 6) вяртанне ў вёску з траецкімі, куставымі песнямі, што азначае завяршэнне перыяду ваджэння вясновых карагодаў, якія не выконваюцца ў іншы час года; 7) святочная вячэра з пазаабрадавымі песнямі.

Гэтыя дзеі, безумоўна, маюць абрадавае паходжанне і былі ў старажытныя часы прысвечаны чарговаму пераломнаму моманту ў жыцці прыроды і адпаведна ў гаспадарчай дзейнасці сялян, звязанаму з адыходам замаразкаў і пераможным панаваннем вясны. Яны маркіруюць сабой узрушэнне жыццядайных сіл прыроды, якія ў жыцці супольнасці гэтак эмацыйна праяўлены гукавой і кінетычнай экспрэсіяй. Гэта моцныя гучныя спевы на адкрытым паветры з яго фанічнымі эфектамі, раскацістым рэхам і звонкай святочнай інтанацыяй, характэрныя для спеваў вясновa-летняга цыклу, калі, паводле назіранняў этнамузыколага, доктара мастацтвазнаўства З. Мажэйкі, з «выхадам на вуліцу», «на волю» («з хаты») сцвярджалася народная школа «галаснога спеву» на адкрытым паветры, а таксама складвалася і народная кінетычна-пластычная школа з майстэрствам ваджэння карагодаў, масавымі шэсцямі-праходамі з канца ў канец вуліцы, уцягваючы ў карагод усё новых удзельнікаў. У кантэксце нашага экспертнага даследавання актуальным з’яўляецца і яшчэ адна заўвага гэтага выдатнага этнамузыкаолага паводле матывацыі абрадавых цырымоній – «затанцоўванне», «закарагоджванне» вясны, якія набывалі ў свядомасці песеннай абшчыны аднолькава дзейснае энергетычнае і медыятыўнае значэнне: «*Семіётызацыя і сімвализацыя галасоў раўназначная семіётызыцыі і сімвалізацыі рухаў*» [1, с. 25].

Што тычыцца кульмінацыйнай абрадавай дзеі – выгнання зімы за вёску – то пластычны код (шэсце шэрагамі счэпленых за рукі жанчын) і музычна-вербальны код абраду (песня «Да проводымо зыму да за гай, за долыну») ярка дэманструюць архаічны тып паводзін супольнасці ў пэўны пераломны час, які ў дадзеным выпадку прыпадае на велікодны перыяд. На думку многіх навукоўцаў, прадстаўнікоў працоўнай тэорыі традыцыйнага календара (В. Чычарава, В. Пропа і інш.), глыбінны механізм функцыянавання земляробчых абрадаў вызначаецца падзелам іх у каляндарным годзе на два вялікія цыклы. Адзін складаюць абрады, якія накіраваны на выкліканне ўраджаю, другі – абрады, якія суправаджаюць ягонае здабыццё [2, с. 16]. Большасць рытуалаў веснавога цыклу не толькі на Заходнім Палессі, але і ва ўсіх рэгіёнах Беларусі накіраваны на забеспячэнне ўраджаю. Таму і зафіксаваныя намі цырымоніі провадаў зімы, фактычна яе выгнанне за вёску, з’яўляюцца своеасаблівым зімова-летнім пераходам, адным з этапаў забеспячэння ўрадлівасці. Нездарма пасля адпраўлення абраду гэты пераход падкрэслены ўжо траецкімі і куставымі песнямі, якія жанчыны спяваюць, вяртаючыся ў вёску, нібы нясуць ужо іншую вестку-спадзяванне на новы лад – «на нова лета».

Рытуал «провадаў зімы» мае засцерагальны характар і адлюстроўвае мэты супольнасці пазбавіцца ад усяго шкоднага, што ў дадзены перыяд замінае сцвярджэнню і росквіту жыцця. Яго асноўную гукавую ідэю – актыўнае сцвярджэнне перамогі жыцця над смерцю – жыхары Пінкавіч штогод актуалізуюць і ўмацоўваюць праз супольнае зладжанае дзеянне і карагодны спеў. Этнаграфічныя запісы сведчаць пра існаванне ў мінулым у вёсках Пінскага і некаторых іншых раёнаў Брэсцкай вобласці розных форм «провадаў зімы», напрыклад, кіданне старымі пасталамі, вымятанне з вуглоў хаты, выкіданне і спальванне дзеркачоў і да т.п. Па меркаванні вядомых даследчыкаў Т. Варфаламеевай, Т. Валодзінай, Т. Кухаронак, матывы выгнання зімы ў цёплыя майскія дні звязаны з матывам выправоджвання продкаў, якія ўшаноўваліся на Заходнім Палессі ў першы дзень Вялікадня і ў чацвер на Велікодным тыдні, а ў Праводную нядзелю іх праводзілі з прасторы жывых за межы паселішчаў [4, с. 124–126]. Праводная нядзеля да гэтага часу прысвечана ўшанаванню продкаў на тэрыторыі суседняй Украіны. У свядомасці сучасных пінкавіцкіх жыхароў не захаваліся такія архаічныя ўяўленні, але яны таксама ўшаноўваюць продкаў і наведваюць магілкі ў чацвер на Велікодным тыдні, а Праводная нядзеля ў іх уяўлені звязана з провадамі свята Вялікадня.

Этнафанічныя асаблівасці выканальніцтва вясновых карагодаў прадэманстраваны ўдзельніцамі гурта «Крыніцы» адмыслова. Яны штогод выконваюць шэраг традыцыйных веснавых карагодаў, кожны з якіх функцыянальна абазначаны сваёй тэматыкай (любоўнай, жартоўнай, сямейна-бытавой, працоўнай), спяваецца ва ўзрушаным эмацыйна-прыўзнятым ключы. Паводле тыпаў інтанавання і галасавядзення яны ўяўляюць сабой «жанры рухальнай дынамікі» (тэрміналогія этнамузыколага В. Ялатава). Больш за тое, карагоды выконваюцца ў гучнай «голаснай» манеры спеваў, з моцнай падачай гуку і энергічным экстравертным гукавылучэннем. Па характары рухальнай дынамікі яны прадстаўлены ў вакальна-танцавальным тыпе інтанавання, аднак некаторыя распеты больш плаўна, з элементамі лірызацыі напеву («Траўка-мураўка» і інш.). Характар рытмічнай, рухальнай пульсацыі пеўчай плыні ўсяго цыклу вясновых карагодаў адпавядае тэматычнаму зместу паэтычных тэкстаў і пластычнай актыўнасці: жартоўны бадзёры настрой карагодаў-гульняў «Скачэ горобэйко», «Пойдэмо ў ляс»; лірызаваныя, больш вакальна распетыя карагодныя песні «Траўка-мураўка», «Да стоіць у лузе каліна», «Ой, поросты, кропэ»; «паходная» рэчытатыўна-вакальна-сігнальная дынаміка і патрабавальна-прыўзняты тонус заклінання на выгнанне зімы падчас шэсця (нават бегу) па вуліцы («Провэдэмо зыму»).

Як ужо было адзначана раней, адзін з галоўных крытэрыяў выканальніцтва песень вясновa-летняга цыкла, асабліва на Палессі – гэта гучныя «галасныя» спевы ў акустыцы прыроднага асяроддзя, якія яскрава дэманструюць экстравертную энергетыку этнафоніі ўсяго вясновa-летняга перыяду. Гэты этнафанічны паказчык у поўнай меры прадстаўлены спявачкамі этнаграфічнага гурта «Крыніцы», што пажадана перадаць і навучэнцам гуртка «Крынічанька».

Народныя веды, сацыякультурны вопыт, народныя мастацкія традыцыі перадаваліся даўней натуральна, ад старэйшага пакалення малодшаму вусным шляхам. Аднак сёння гэты працэс вуснай перадачы адбываецца далёка не ў кожнай, нават вясковай сям’і. Сучасныя ўрбанізаваныя ўмовы вымагаюць іншых падыходаў і шляхоў перадачы этнамастацкага і жыццёвага вопыту. Апошнім часам аматарская творчасць пакрысе займае гэту нішу, таму ўдзел дзяцей і моладзі, людзей сярэдняга і больш сталага ўзросту ў аматарскіх фальклорных гуртах з’яўляецца адным з эфектыўных сродкаў захавання і перадачы гістарычнай памяці і мастацкіх праяў жыцця і побыту нашых продкаў. Вельмі важна, калі аматарскі фальклорны калектыў захоўвае і развівае ў сваёй дзейнасці мясцовыя мастацкія праявы народнай культуры, больш за тое, калі гэта дзейнасць сістэматызавана паводле народных святочных традыцый у разуменні канцэптуальнай ідэі ўніверсальнасці традыцыйнага календара як дзейснага сродка этнавыхавання і культурнага самазахавання народу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Фальклорныя калектывы СДК вёскі Пінкавічы захоўваюць свае вясковыя абрадавыя традыцыі і побытавыя практыкі, узнаўляючы кожны год святочны настрой каляндарных свят для сябе і аднавяскоўцаў. Таму іх штогадовая духоўная праца па ўзнаўленні гэтага настрою праз захаванне традыцыі вясновых карагодаў мацуе вузлы нашай этнічнай еднасці і нацыянальнай самасвядомасці, эстэтычна і энергетычна напаўняе жыццё пінкавіцкай вясковай супольнасці, а таксама гледачоў і гасцей свята з іншых мясцовасцей.

Вядома, што са згасаннем магічнай скіраванасці абрадавых практык супольнасці знікае і іх асноўная – магічная – функцыя. Аднак немалаважнымі сёння з’яўляюцца дапасаваныя да яе эстэтычная і рэкрэацыйная, а таксама сацыяльна-кансалідуючая функцыі, якія абвастраюць сэнсы, актуальныя для сучасных людзей, і нават збліжаюць іх эмацыйна з людзьмі старэйшага пакалення, утвараюць духоўную сувязь з продкамі [3]. Гэта настройка душы на ўзнёслы, радасны і прыўзняты лад быцця праз песню, гульню, карагод. Праз свята і яго кампаненты магчыма эмацыйна спрычыніцца да ўзнёслага стану душы нашых продкаў, якія звярталіся да прасторы як ландшафтна-тэмпаральнай праявы вышэйшых сіл, са сваімі спадзяваннямі на далейшы лад у сям’і і гаспадарцы, росквіт жыцця на зямлі, што праяўлялася ў надзвычай эмацянальнай падачы голасу, вірлівасці карагодаў. Магчыма праз гэтае фізічнае галасавое і пластычнае ўздзеянне на веснавую прастору людзі падсвядома імкнуліся і свае сілы ўзнавіць ад роскіВіту прыроды і прыгажосці квітнеючага свету. На думку аўтара гэтых радкоў, як эксперта-этнафоназнаўцы, гэта веснавая сугестыя і экспрэсія выканання, па сутнасці, узмацняе і сёння спеўную супольнасць і кожнага з яе ўдзельнікаў паасобку, таму што энергія ўзнёслага чакання і спадзеву на лепшае спараджае вялікія прадуцыравальныя сілы духу чалавека, узмацняе салідарнасць і ўзаемападтрымку ў жыццядзейнасці грамады. Гэтыя думкі і пачуцці выспяваюць на такіх святочных дзеях, як у Пінкавічах, і яшчэ раз пераконваюць у неабходнасці падтрымліваць і ўхваляць дзейнасць такіх калектываў як «Крыніца» і «Крынічанька», якія маюць усе неабходныя складнікі для неацэннай дзейнасці па захаванні мясцовай гаворкі, музычных і харэаграфічных традыцый і працягу іх жыцця праз далучэнне дзяцей і моладзі, аднавяскоўцаў да супольнага святкавання.

**Спіс літаратуры:**

1. Мажэйка, З. Каляндарна-песенныя традыцыі / Зінаіда Мажэйка // Беларусы. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – Т. 11. Музыка. – С. 14–41.
2. Можейко, З. Календарно-песенная культура Белоруссии : Опыт системно-типологического исследования / Зинаида Можейко. – Минск : Навука і тэхніка, 1985. – 245 с.
3. Пладунова, Т. Сацыяльная значнасць каляндарна-абрадавых святкаванняў у сучасным грамадстве / Таццяна Пладунова // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; навук. рэд. А. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2020. – Вып. 27. – С. 327–331.
4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : У 6 т. / В. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – Т. 4. Брэсцкае Палессе : У 2 кн. – Кн. 1 – 559 с. : каляр. іл. .
5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : У 6 т. / А. Боганева [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2009. – Т. 4. Брэсцкае Палессе : У 2 кн. – Кн. 2. – 863 с. : каляр. іл., 1 электрон.-апт. Дыск (CD-Rom).

***Екатерина Йова́нович***

## РАЗВИВАЮЩЕЕ ВЛИЯНИЕ АКТУАЛЬНЫХ МАЛЫХ ФОЛЬКЛОРНЫХ ЖАНРОВ ПРИ КОРРЕКЦИОННОЙ РАБОТЕ С ДЕТЬМИ, ИМЕЮЩИМИ ПАТОЛОГИИ РЕЧИ

*В данной статье рассматриваются проблемы коррекционного воспитания и обучения детей среднего дошкольного возраста с различными патологиями речи в целях формирования познавательной мотивации и речемыслительной деятельности обучаемых. На примере деятельности российских логопедов из Тюмени уточняется, какое влияние оказывает на развитие ребенка использование малых фольклорных жанров родителями в семье, а также какие малые фольклорные жанры бытуют в современных семьях России.*

***Ekaterina Jovanovic***

## DEVELOPING INFLUENCE OF MODERN SMALL FOLKLORE GENRES DURING CORRECTIONAL THERAPY WITH CHILDREN WITH SPEECH LAG

*This article discusses the problems of correctional education and training of children of middle preschool age, with various speech pathologies in order to form cognitive motivation and speech-cognitive activity of children. What influence does the use of small folklore genres by parents in the family have on the development of the child. What small folklore genres exist and are used in modern Russian families.*

В XXI в. вопросы раннего речевого развития рассмотрены в российской педагогике весьма подробно. Как отмечает Елена Климкина, «Были исследованы закономерности речевого развития в раннем возрасте, рассмотрен генезис овладения ребёнком вербальными и невербальными средствами общения, выделены психофизиологические и социальные условия успешности овладения речью, а также факторы, приводящие к нарушению нормального хода речевого развития и проявления таких нарушений в раннем возрасте. Обращалось внимание на возможности малых фольклорных форм в преодолении нарушений речевого развития у детей раннего и дошкольного возраста (А. Иванова, 2014; Т. Котлякова, 2001; Л. Лопатина, 2014; Н. Серебрякова, 2014). Предлагались методические рекомендации по использованию малых фольклорных форм в ходе коррекционно-педагогической работы при обучении детей дошкольного возраста с нарушением речевого развития (Т. Пескишева, 2008)» [4].

Дошкольный возраст – важный этап в подготовке гармонично развитой личности ребенка. Одним из показателей готовности к обучению является хорошо развитая речь, а при подготовке к школе ребенку важно избежать т. н. общего недоразвития речи. Логопеды отмечают: «Общее недоразвитие речи (ОНР) – различные сложные речевые расстройства, при которых нарушается формирование всех компонентов речевой системы, то есть звуковой стороны (фонетики) и смысловой



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ